# *Ave Maria*

*(Cuncti simus concanentes)*

*14 ст.*

*Пераклад З. Сасноўскага*




*REF. Заспявай адзінай панне*
*Авэ Марыя!*
*Славу, гонар, шанаванне*
*Авэ Марыя!*

*1. Была пані на самоце,*
*Калі завітаў анёл*
*Габрыэль у Божай цноце*
*Да яе з нябёс сыйшоў*
*REF.*

*2. Разнасіў анёл бясконца*
*Песню словаў залатых*
*Блаславёная пад сонцам*
*Ты, Марыя, назаўжды*
*REF.*

*3. Атрымаеш светлы цяжар*
*Светлую надзею з ім*
*Запануе ў табе радасць*
*Радуйся дарам святым*
*REF.*

*Copyright © Stary Olsa*

*4. Вестка добрая лунае*
*Над сусветам над усім*
*Над зямлёю і над Раем*
*Трубіць славу херувім*
*REF.*

*5. Бездакорная Марыя*
*Блаславёная ва ўсім*
*У радасці народзіш сына*
*Прыйдзе ратаванне з ім.*
*REF.*

*6. Езус будзе яму імя*
*Найславутае навек*
*Гімны пець табе, Марыя,*
*Будзе кожны чалавек.*
*REF.*

*Copyright © Stary Olsa*